# ФІЛАСОФІЯ ДЫЗАЙНА ГЛЭНА ПАРСАНСА

# GLEN PARSONS' DESIGN PHILOSOPHY

Дз. В. Дзьячкова
Dz. Dzyachkova

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Мінск, Рэспубліка Беларусь
Belarusian State University
Minsk, Republic of Belarus
*e-mail: dziyana.dzyachkova@gmail.com*

---

Артыкул прысвечаны асэнсаванню філасофскіх ідэй Глэна Парсанса, прадстаўленых у яго даследаванні «Філасофія дызайну». Прааналізаваны асноўныя ідэі кнігі, паказана іх актуальнасць для развіцця дызайн-дзейнасці.

*Ключавыя словы:* філасофія дызайну; мадэрнізм; эпістэмалагічная праблема; довад за лепшую рэалізацыю

The article is devoted to understanding the philosophical ideas of Glenn Parsons, presented in his study "Philosophy of Design". The paper analyzes the main ideas of the book, their relevance for the development of project activities.

*Keywords:* design philosophy; modernism; epistemological problem; argument for a better implementation

---

Значэнне дызайну ў сучасным свеце павялічваецца, і ўзнікае неабходнасць яго грунтоўнага філасофскага асэнсавання. Напачатку новага стагоддзя навукоўцы прызналі важнасць і актуальнасць афармлення асобнай дысцыпліны – філасофіі дызайну – і адзначылі, што дызайн «варты самастойнага філасофскага даследавання» [1, ст. 11]. Адным з піянераў такога даследавання выступіў Глэн Парсанс (*Glenn Parsons*) – канадскі навуковец у галіне эстэтыкі, метафізікі і філасофіі навукі, супрацоўнік Універсітэта Раерасана ў Таронта (*Toronto Metropolitan University*). Фундаментальная праца Г. Парсанса «Філасофія дызайну» (*"The Philosophy of Design"*) была выдадзена ў 2005 г.

Даследаванне складаецца з сямі раздзелаў, у кожным з якіх асэнсоўваецца той ці іншы аспект дызайну: «Што такое дызайн?»; «Дызайн-працэс»; «Мадэрнізм»; «Выражэнне»; «Канцэпцыя функцыі»;

«Функцыя, форма і эстэтыка»; «Этыка». Вучоны слушна падкрэслівае значнасць філасофскай спадчыны мадэрнізму для развіцця дызайну і вызначае, якія з філасофскіх пошукаў мадэрнізму могуць быць пераняты філасофіяй дызайну.

У першым раздзеле кнігі аўтар прыводзіць азначэнне дызайну: «Дызайн – гэта мэтанакіраванае рашэнне праблемы з дапамогай стварэння планаў для новай рэчы, прычым планы гэтыя на першы погляд не могуць здацца разважліваму чалавеку неадпаведным рашэннем дадзенай праблемы» [1, ст. 19]. Можна пагадзіцца з такім азначэннем у самым шырокімсэнсе. Пры гэтым варта адзначыць, што паўнавартаснае развіццё любой галіны чалавечай дзейнасці магчыма толькі пры адпаведным заканадаўчым і прававым дзяржаўным урэгуляванні. Гэты аспект дызайна патрабуе самастойнага асвятлення.

Цікавае пытанне, якое разглядае Парсанс – эпістэмалагічнае. Вучоны аналізуе ідэі розных філосафаў наконт таго, адкуль у дызайнера з'яўляецца «апраўданая вера» (*"justified belief"*) у свае рашэнні. У гэтым сэнсе карыснай з'яўляецца праца *"Design Thinking: Understanding How Designers Think and Work"* (2011) Найджэла Кроса (*Nigel Cross*). У чацвёртай частцы кнігі "*How Designers Think*" [2, ст. 63] добра відаць, што для разумення дызайн-працэсу аўтар разглядае не толькі сам працэс, але і біяграфію таго дызайнера, які ўдзельнічае ў эксперыменце. Думаецца, гэта апраўдана: аб'ём ведаў кожнага такога спецыяліста і багаты жыццёвы вопыт могуць абумовіць поспех у дызайн-дзейнасці. Чым больш дызайнер ведае, тым больш варыянтаў для рашэння праблемы ён можа прыдумаць, пасля чаго з дапамогай канвергенцыі абраць лепшы варыянт, прычым адбор варыянта можа адбыцца цалкам інтуітыўна.

У чацвёртым раздзле даследавання Г. Парсанс абмяркоўвае «довад за лепшую рэалізацыю» ("*Better Realization Argument*") [1, ст. 93–98]. З дапамогай гэтага доваду аўтар паказвае, што экспрэсіўны аспект з дызайна можна выключыць. Ён апісвае гэта так:

1. «Дызайн ствараецца экспрэсіўным (выразным) для таго, каб адлюстроўваць нашы каштоўнасныя характарыстыкі.
2. Калі ў нейкага прадмета *X* ёсць пэўная характарыстыка *P* для здзяйснення функцыі *F* (і ў *P* няма ніякіх іншых пераваг), але *F* здзяйсняецца лепей з дапамогай чагосьці іншага, то *P* не з'яўляецца ўдалай характарыстыкай прадмета *X*.

3. Выяўленне нашых каштоўнасных характарыстык здзяйсняецца з дапамогай экспрэсіўных дызайн-прадметаў горш, чым з дапамогай іншых сродкаў (гэта значыць [нашых] дзеянняў).
4. У экспрэсіўнасці дызайну няма ніякіх іншых пераваг.
5. Значыць, экспрэсіўнасць (выражэнне) не з'яўляецца ўдалай характарыстыкай дызайну» [1, ст. 97].

Варта адзначыць, што Глэн Парсанс звязвае «довад за лепшую рэалізацыю» з мадэрнісцкімі філасофскімі напрацоўкамі, у прыватнасці, з эсэ Адольфа Лоаса «Арнамент і злачынства». Апрача гэтага, Парсанс, спрабуючы асэнсаваць ідэі мадэрнізму, вызначае функцыянальнасць як найважнейшы аспект дызайн-прадукта, выстаўляючы другаснымі астатнія складнікі дызайна, такія як выражэнне, што падаецца не вельмі лагічным.

На думку аўтара, для таго, каб рэалізаваць каштоўнасныя характарыстыкі, неабходна вылучэнне праблемы, спосаб прымянення прадмета і асаблівае спалучэнне механізмаў гэтага прадмета. Усё пералічанае і з'яўляецца выражэннем у дызайне. Функцыя – гэта толькі выражэнне ў дзеянні. Без выражэння яна не можа існаваць. Выражэнне каштоўнасных характарыстык чалавека не можа абысціся толькі яго дзеяннямі, бо для таго, каб штосьці здейсніць, нам патрэбны прадметы.

Фундаментальная праца Г. Парсанса 2005 года выдання, несумненна, з'яўляецца важным укладам у развіццё філасофіі дызайну. Даследаванне Глэда Парсана «Філасофія дызайна» можа стаць грунтоўнай базай для далейшай распрацоўкі прадстаўленых у ёй ідэй з улікам сучаснага тэхналагічнага развіцця.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ

1. *Parsons G.* The Philosophy of Design. Cambridge; Malden : Polity Press, 2016.
2. *Cross N.* Design Thinking: Understanding How Designers Think and Work. Oxford : Bloomsbury, Berg, 2011.